Падтрымай "Вясну" на PATREON

Грамадскі актывіст Юры Глебік аштрафаваны на 40 базавых велічынь

18.11.2016 **Тэгі**: адміністратыўны пераслед, акцыі, свабода мірных сходаў



Юрый Глебік

18 лістапада ў Свіслачы адбыўся першы працэс па адміністрацыйнай справе за ўдзел у Дні памяці паўстанцаў 1863 году, які прайшоў 30 кастрычніка ў Свіслачы і Якушоўцы.

Радыё Рацыя паведамляе, што старшыня Свіслацкага раённага суда **Аляксандр Шылін** засудзіў грамадскага актывіста **Юры Глебіка** да 40 базавых велічынь штрафу. „Разгляд" справы прайшоў па звыклым сцэнары. Сведкамі, як і ў ранейшыя гады выступалі свіслацкія міліцыянты Аляксандр Гуштын і Юрый Садоўскі. Юры Глебік прысутнічаў у судзе і даводзіў, што ён нічога не парушаў, аднак суддзя па завядзёнцы не прыняў яго аргументаў. У выніку Аляксандр Шылін палічыў Юрыя Глебіка вінаватым у парушэнні артыкулу 23.34 Кодэксу аб адміністрацыйных правапарушэннях Рэспублікі Беларусь (парушэнне парадку арганізацыі ці правядзення масавага мерапрыемства) і пакараў яго вялікім штрафам.

Юры Глебік перакананы, што працэс меў чыста заказны палітычны характар і ніякага юрыдычнага разгляду справы насамрэч не было. Старшыня Свіслацкага суду Аляксандр Шылін у ранейшыя гады – у 2012-м, 2014-м і 2015 гадах ужо засуджваў грамадскіх актывістаў да адміністрацыйнага арышту і штрафаў за ўдзел у традыцыйным Дні памяці паўстанцаў.

Бліжэйшым часам чакаецца разгляд яшчэ не менш 10 аналагічных адміністрацыйных спраў, многіх удзельнікаў фэсту з розных гарадоў Беларусі ўжо шукалі міліцыянты, каб паведаміць пра складзеныя пратаколы пра нібыта адміністрацыйныя правапарушэнні. Вядома, што пратакол правапарушэння за ўдзел у Дні памяці паўстанцаў 1863 году складзены на актывіста з Бярозаўкі **Вітольда Ашурка**. Таксама позвы з патрабаваннем з'явіцца ў Свіслацкі РАУС 17 лістапада атрымалі старшыня Партыі БНФ **Аляксей Якукевіч** і бард **Зміцер Захарэвіч.**

Твитнуть


#FREEVIASNA


Вясна. Правы чалавека ў …
9 958 "Нравится"
ВЯСНА
Нравится
Свяжитесь с нами


СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ
Бабруйчаніна будуць судзіць за "публічныя заклікі да арганізацыі мітынгу". Распавядаем, што гэта за артыкул
"Не менш за 100 000 чалавек укрыліся за мяжой". Выйшаў даклад УВКПЧ ААН пра сітуацыю ў Беларусі (дакумент)
Чатырох жыхароў Паставаў асудзілі да "хатняй хіміі" за фотаздымак з Маршу (дапоўнена)
Заява праваабаронцаў аб прызнанні 20 палітычных зняволеных
WWW.GAZETABY.CO



ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў

"Усё зроблена, каб паралізаваць тваю волю", — былая палітзняволеная Вольга Класкоўская

"Гэта ўсё адно велізарнае злачынства супраць чалавечнасці", — былы палітвязень шклоўскай калоніі

"Мораць голадам і холадам". Новыя сведчанні пра катаванні і акалічнасці смерці Вітольда Ашурка ў ПК-17



ГАЛОЎНАЕ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023



#ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Гэта ўсё адно велізарнае злачынства супраць чалавечнасці", — былы палітвязень шклоўскай калоніі

Палітзняволенай Вікторыі Кульшы ў трэці раз дадалі трэмін па крымінальнай справе

Мужчыну асудзілі на два гады калоніі па двух дыфамацыйных артыкулах

Паўтара года калоніі прысудзілі экс-кандыдату ў прэзідэнты Андрэю Дзмітрыеву

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў

Дырэктару газеты "Белорусы и рынок" Канстанціну Залатых прысудзілі чатыры гады калоніі

Да пяці гадоў калоніі. Асудзілі палітвязняў, якія вывесілі нацыянальныя сцягі Беларусі і Украіны

Дайджэст вызваленых: 12 палітвязняў у сакавіку цалкам адбылі тэрміны і выйшлі на волю

"Могуць з'яўляцца злачынствамі супраць чалавечнасці". Што азначае гэтая фармулёўка ў дакладзе ААН пра Беларусь?

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023



ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022





ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

ADC Memorial
Anti-Discrimination Centre

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh











E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

